# Ад іх прамяніць прыгажосць

У кастрычніку лісце гарадскіх дрэваў напаўняецца казачнымі колерамі. Іх маляўнічасць падкрэслівае блакіт восеньскага неба і свежасць яшчэ зялёнай травы. Людскія вочы вабяць разнастайныя залаціста-жоўтыя адценні, якія ўздымаюць настрой, напаўняюць натхненнем душу. Асабліва, калі гэта душа творчая, душа мастака. Ну а калі і сам горад багаты на дзівосныя краявіды, то такія месцы глыбока западаюць у сэрца майстра, і ён звязвае з імі ўсё сваё жыццё і ўвесь свой талент.



Менавіта да такіх мастакоў адносіцца і Валерый Сідоркін. На жаль, яго ўжо няма з намі. Але яго спадчына, яго надзвычай таленавітыя творы беражліва захоўваюцца яго роднымі, і гэтыя творы дзе-нідзе з'яўляюцца на розных выставах, каб парадаваць неабыякавых да мастацтва людзей.

Вось і зараз у мастацкай галерэі «Зачараваныя родным краем» Мазырскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна наведнікі могуць бліжэй пазнаёміцца з некаторымі карцінамі В. Сідоркіна. Адкрыццё выставы «Восеньская мелодыя» адбылося 7 кастрычніка дзякуючы жонцы і дачцэ мастака – Раісе Уладзіміраўне і Кацярыне Валер'еўне, якія прысутнічалі на сустрэчы. Цікавую праграму імпрэзы падрыхтавала бібліятэкар краязнаўчага сектара Ніна Цюленева. Пад час сустрэчы выступілі настаўніца гарадской гімназіі імя Янкі Купалы Таццяна Севярын, паэт Васіль Андрыеўскі, мастак Анатоль Налівайка. Прагучала шмат цёплых і сардэчных словаў. Пасля былі гутаркі, фотасесія, прыемныя знаёмствы паміж сабою.

Карціны В. Сідоркіна сапраўды заварожваюць! Ад іх прамяніць прыгажосць не проста восеньскай прыроды, але прыгажосць менавіта нашага роднага краю, нашай непаўторнай Мазыршчыны.

*Таццяна ПРАКОПЧАНКА,*
*г. Мазыр*
*Фота*
*з сямейнага архіва Сідоркіных*